■ Сваімі рукамі

# ВЫХАВАННЕ ПРЫГАЖОСЦЮ

## У Ашмянскую школу прыязджаюць на фотасесію нават з іншых раёнаў

**Незвычайна, але факт: вясельныя картэжы, каб сфатаграфавацца, ужо неаднойчы спыняліся ў Ашмянах каля сярэдняй школы № 1. І не толькі мясцовыя жыхары, але нават і госці з суседніх раёнаў. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў дырэктар школы, заслужаны настаўнік Беларусі Міхаіл ГРУЖЭЎСКІ.**

Чым жа так прываблівае, здавалася б, звычайная прышкольная тэрыторыя? Гэта цяжка перадаць словамі — трэба бачыць. Дзівосны прыродны куток, які шмат гадоў таму стаў стварацца па ініцыятыве Міхаіла Мар'янавіча. Пачыналі з некалькіх кветкавых клумбаў, а цяпер тут ужо сапраўдны парк, упрыгожаны шматлікімі відамі раслін і рознымі архітэктурнымі формамі. Усё сваімі рукамі — настаўнікаў і вучняў. Для сябе і ўсіх, каму такое хараство не толькі даспадобы, але і дае прыклад для пераймання.

— Не цікава, калі нічога ля школы не змяняецца. Тым больш што задум і фантазіі ў нас хапае. Два гады таму, напрыклад, з'явіўся вось гэты «замак», сёлета — новыя кветачніцы з каменю. А крыху раней — адзін, потым другі фантан, — зазначае Міхаіл Гружэўскі.

Фантаны, паколькі ваду трэба эканоміць, працуюць не пастаянна, а ў асноўным падчас школьных свят. Акрамя таго, зрабілі замкнуты цыкл водазабеспячэння паркавай тэрыторыі: помпа гоніць ваду ўгору, а адтуль яна ідзе самацёкам.

Зразумела, што клопатаў паркавая гаспадарка, а таксама школьны стадыён патрабуюць шмат, асабліва летам, калі трава расце як на дражджах. Для гэтага дзеці штодзённа па графіку прыходзяць сюды на працоўную практыку.

Мясцовыя жыхары, паколькі ў мікрараёне Заходні такой зоны адпачынку пакуль няма, амаль штодзённа карыстаюцца паслугамі школы. У парку адпачываюць мамы з калясkамі, на стадыёне гуляюць не толькі выхаванцы гэтай навучальнай установы, а ўсе ахвотныя. Уваход вольны, брамка зачыняецца толькі на ноч. Вядома, вартаўнік сочыць за парадкам, аднак нічога дрэннага ніколі не здаралася. Пэўна, прыгажосць, якая тут стала ўжо нормай, выхоўвае не толькі школьны калектыў.

**Пачыналі з некалькіх кветкавых клумбаў, а цяпер тут сапраўдны парк. Усё зрабілі сваімі рукамі — настаўнікаў і вучняў. Для сябе і ўсіх, каму такое хараство не толькі даспадобы, але і дае прыклад для пераймання.**

— Складаем графік водпускаў так, каб на стадыёне пастаянна быў наш настаўнік — прыглядваў за дзецьмі, выдаваў мячы, нешта арганізоўваў, — кажа Міхаіл Гружэўскі.



Міхаіл ГРУЖЭЎСКІ з сёлетнімі выпускнікамі школы.

Дарэчы, у школе можна павучыцца не толькі ўзорнаму парадку, што неаднойчы адзначалася на абласных і рэспубліканскіх конкурсах, але і ўменню зарабляць грошы. Сёлетняе заданне (220 мільёнаў рублёў) ужо перавыканалі — дзякуючы платным адукацыйным паслугам, здачы металалому і макулатуры, а таксама канцэртам. У школе тры ўзорныя калектывы — фальклорны тэатр песні і танцу «Званочкі», эстрадная студыя «Палёт» і тэатр танца «Эфект». Яны ладзяць шмат канцэртаў, асабліва ў перыяд калядных свят — у зале заўсёды аншлаг. Акрамя таго, залу (сёлета райвыканкам дапамог абнавіць апаратуру) арандуюць іншыя арганізацыі і прадпрыемствы. Гэта таксама папаўняе школьны бюджэт.

Дзеля агульных інтарэсаў працуе і... школьная кабыла. Калі камусьці спатрэбіцца, то Машка (вядома ж, за пэўную плату) дапаможа на прысядзібным участку. А зімой яе запрагаюць у сані, каб пакатаць дзяцей па стадыёне. Ахвотнікаў нямала, бо цана новых уражанняў сімвалічная.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*
*г. Ашмяны*




Фота Святланы МУЦЯНСКАЙ.

# АСЦЯРОЖНА: ДЗЕЦІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Абмяжуйце і вольны доступ да лекаў, якія захоўваюцца дома. Рознакаляровыя прыгожыя таблеткі і ёмістасці, у якіх яны захоўваюцца, так і цягнуць да сябе дзіцячыя вочы. Нядаўна ў Малдове дзяўчынка праглынула лекі для прафілактыкі венозных трамбозаў і нейкія псіхатропныя прэпараты, якія прымала яе бабуля. Здарылася гэта літаральна за адно імгненне, калі старая адвярнулася. У бальніцу дзяўчынку даставілі ў цяжкім стане — моцна парушылася маўленне і рухальная актыўнасць... А яшчэ здараюцца выпадкі, калі старыя людзі незнарок блытаюць паміж сабой лекі з-за падобных па колеры і форме ўпаковак. І замест звычайных таблетак супраць кашлю даюць маламу, напрыклад, моцны седатыўны сродак. Канчаецца гэта ў лепшым выпадку шпіталізацыяй.

Замяніўшы разраджаную батарэйку, не адкладвайце яе на стол, а выносьце адразу ж у спецыяльны кантэйнер. Асабліва небяспечныя для дзяцей так званыя «кнопкавыя» элементы сілкавання, якія ўжываюцца ў разнастайных цацках, з-за сваіх мініяцюрных памераў. Як канстатуюць медыкі, у апошнія гады дзеці батарэйкі глытаюць часцей. Пасля таго, як такі «сюрпрыз» захрас у стрававodзе, праз пару гадзін слізістая абалонка атрымлівае моцны хімічны апёк ад электраліту, які пачынае выцякаць з батарэйкі. Але калі батарэйку на гэтым этапе не дастануць урачы, то разбуральны працэс працягвае ісці далей. Таму лепш устрымацца ад куплі такой цацкі, калі ў ёй няма магчымасці надзейна ізаляваць ад маленькага эксперыментатара адсек з батарэйкамі. «Пальчыкавай» ці «мезенчыкавай» батарэйкай дзіця проста можа падавіцца, як адбылося два гады таму ў Гродзенскай вобласці.



### ЧЫМ КАРЫСНЫ РАДЫУС БЯСПЕКІ?

— Пліты і вокны таксама прыцягваюць увагу дзяцей, — працягвае Віталь Навіцкі. — Таму не падпускайце на кухню малога, калі на пліце стаіць ёмістасць з гарачай вадой ці кіпенем. А на аконных рамах лепш паздымайце ручкі, асабліва калі вы ўсталявалі маскітныя сеткі на цёплы перыяд. Будзе крыху нязручна адчыняць і зачыняць форткі, але затое ж ваша дзіця будзе ў бяспецы. Калі ж вы адчынілі фортку самі, будзьце пільнымі. Дастаткова прыгадаць нядаўні выпадак у Мінску, калі шасцігадовы хлопчык гуляў каля акна і абаперся на сетку. Вагі малога яна не вытрымала, і дзіця звалілася ўніз з трэцяга паверха. У бальніцы яно сканала...

Проста перадаць улетку маленькага чалавечка пад апеку бабе і дзеду нельга. Спярша трэба стварыць так званы «радыус бяспекі». Ахоп яго залежыць ад узросту дзіцяці. Напрыклад, калі вашаму малому сем гадоў, то радыус бяспекі мусіць быць прыкладна кіламетровы. І чым дзіця большае, тым гэтая велічыня павінна павялічвацца. Стапрацэнтнай гарантыі радыус, вядома, не дасць, аднак многія патэнцыйныя пагрозы папярэдзіць можа. Асноўныя крыніцы небяспекі ў доме мы ўжо прааналізавалі вышэй. За межамі дома трэба вельмі ўважліва праінспектаваць тэрыторыю і выявіць усе патэнцыяльна небяспечныя месцы. Гэта можа быць якісьці вадаём, лясны масіў, будоўля, праезная частка, бярвенне, якое складзена ў штабелі. У гарадскім двары гэта ўсе гульнявыя канструкцыі кшталту арэляў і каруселяў. Не лянуйцеся праверыць іх асабіста на трываласць: абследаванне зойме максімум паўгадзіны. І пасля гэтага трэба правесці поўны інструктаж з дзіцем. Пры гэтым звярніце ўвагу на спецыфіку дзіцячай псіхалогіі. Чым узрост меншы, тым большую ўвагу трэба засяроджваць на момантах кшталту «не рабі, не хадзі, не чапай». Аднак са сталеннем дзіцяці трэба ўжо болей расказваць, чаму нельга рабіць пэўныя дзеянні, і прапаноўваць бяспечную альтэрнатыву.

Ратаўнікі не раяць пакідаць малога пад наглядам старэйшых дзяцей. Шанцы на тое, што яны загуляюцца і на некаторы час страцяць кантроль над малым, высокія. А адыграць сітуацыю назад, як у камп'ютарнай гульні, будзе ўжо немагчыма. Здараецца і так, што бацькі пакінулі малога дома аднаго раз, другі, а калі нічога не адбылося, то робяць выснову, што і надалей нічога не здарыцца. Але гэта насамрэч не так.

### ДАЙЦЕ ЧАС НА АДАПТАЦЫЮ

Перамена гарадской абстаноўкі на вясковую больш за ўсіх небяспечная датычна паводзін на дарозе. Дзіця, якое праводзіць пераважную частку года ў гарадскіх умовах, паступова прывыкае да таго, што на вуліцах шмат аўтамабіляў, а ў дварах яны перасоўваюцца з невялікай хуткасцю, якая абмежавана Правіламі дарожнага руху да 20 км у гадзіну. А ў вёсцы часам няма ні святлафораў, ні спецыялізаваных пешаходных пераходаў. Машыны ездзяць рэдка. Гэта і падкупляе маленькага пешахода, але... З-за таго, што дарогі вольныя, аўтамабілі ездзяць значна хутчэй. І калі ў гарадскім двары кіроўца яшчэ мае шанцы паспяхова ўдарыць па тармазах, то на вясковай вуліцы яны ўжо змяншаюцца.

Неўзабаве дзеці пачнуць вяртацца з вёсак у горад, каб падрыхтавацца да новага навучальнага года. Таму некалькі дзён лепш не адпускаць малых адных на вуліцу. За гэты перыяд яны якраз адаптуюцца да ранейшых умоў — запаркаваных аўтамабілямі двароў і інтэнсіўнага руху па вуліцах...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ З чыстага ліста

# АД ВАЙНЫ ЗБЕГЛІ

## Цяпер уцекачам трэба адаптавацца жыць у краіне з адрознай культурай

**Некалькі месяцаў таму з Сірыі ў Гомель прыбылі тры сям'і, якія сёння чакаюць прысваення статусу бежанца. Дарэчы, па праграме ААН ім былі прадастаўлены новыя кватэры з мэбляй і неабходнай бытавой тэхнікай.**


Сям'я Імада Ахмада.

Між іншым, тры сям'і — гэта 14 чалавек. Хутка іх колькасць павялічыцца, бо Саза Ахмад літаральна праз месяц стане матуляй пяты раз. Яе муж Імад нядаўна працаўладкаваўся ў адзін з гомельскіх рэстаранаў. Стравы, якія ён гатуе, карыстаюцца папулярнасцю ў наведвальнікаў. Сярэдняя дачка Сазы і Імада падышла да мяне знаёміцца, назвала сваё імя: Зейна. Кемлівая дзяўчынка паўтарае словы на чужой для яе мове і, глядзіш, неўзабаве хутка будзе сама вучыць бацькоў.

Дарэчы, адаптацыя для грамадзян краіны зусім іншай культуры адбываецца дастаткова складана. Крыху размаўляць за гэты час навучыліся толькі мужчыны. Дарэчы, адзін з іх мову ведае лепш за іншых. Хасан Шыбат заканчваў Харкаўскі медыцынскі ўніверсітэт і таму цяпер для ўсіх з'яўляецца перакладчыкам. Спадзяецца, што хутка атрымаецца пацвердзіць свой дыплом і пачаць працаваць па спецыяльнасці.

Канфлікт у Сірыі доўжыцца ўжо пяць гадоў. Узброеныя сутыкненні прывялі да таго, што больш за тры мільёны чалавек сталі бежанцамі. Амаль 100 з іх знаходзяцца ў Беларусі. Як і іншыя, Мухамед Чыку вывез сям'ю далей ад вайны. У родным Кабане радыкальныя ісламісты спалілі яго краму і збіраліся распраўіцца з жонкай і дзецьмі. Потым былі ўцёкі ў ліванскі офіс ААН, а ўжо адтуль іх адправілі ў Беларусь. Усе ў адзін голас кажуць, што ў нашай краіне ім вельмі падабаецца: чыста, спакойна, вельмі добразычлівыя людзі.

Бежанцаў у Беларусі пад свой кантроль узялі супрацоўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў: разам з прадстаўнікамі ААН яны займаюцца адаптацыяй замежнікаў. Не ўсё адбываецца хутка і проста, як бы хацелася. Магчыма, не супадаюць чаканні і рэчаіснасць. Да таго ж замежнікі добра ведаюць пра тыя «тлустыя» дапамогі, якія атрымліваюць іх суайчыннікі ў аналагічных сітуацыях у некаторых краінах Заходняй Еўропы. І чамусьці ўпэўнены, што так павінна быць і ў Беларусі. У нашай краіне, напрыклад, частка тых дапамог, якія прадастаўляюцца бежанцам, потым ідзе на аплату іх жылля.

Начальнік упраўлення па грамадзянстве і міграцыі УУС Гомельскага аблвыканкама Ірына Кобрусева гаворыць, што наш бок імкнецца стварыць камфортныя ўмовы для пражывання грамадзян Сірыі:

— На заканадаўчым узроўні ёсць магчымасці, каб аказаць дапамогу гэтым сем'ям. Неабходна толькі жаданне саміх грамадзян як мага хутчэй інтэгравацца ў наша грамадства, вучыць мову, пайсці працаваць і зарабляць сродкі на сваё жыццё.

Прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі Жан Іў Бушардзі нядаўна пабываў з афіцыйным візітам у Гомельскай вобласці. Ён адзначыў, што прадстаўніцтва хадайнічае пра павелічэнне бюджэту для аплаты выдаткаў на арэнду жылля, медыцынскіх і іншых паслуг для вымушаных перасяленцаў. Дарэчы, размова ішла не толькі пра сірыйцаў, але і пра грамадзян Украіны. Ён адзначыў, што арганізацыя і надалей працягне цеснае супрацоўніцтва з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа, Дэпартаментам па грамадзянстве і міграцыі і іншымі партнёрамі.

Разам з дыпламатам у Гомельскай вобласці пабывала сірыйскі фундатар, член Мінскага міжнароднага клуба жонак паслоў і дыпламатаў Эўлін Абейд Юсэф. Яна адзначыла, што неабходна вывучыць патрэбы выхадцаў з Сірыі, каб наладзіць цесны кантакт з імі і аказваць дапамогу на пастаяннай аснове.

Таксама праведзены перамовы з кіраўніцтвам гомельскага прадпрыемства ААТ «Сейсматэхніка» па пытаннях працаўладкавання вымушаных мігрантаў з Украіны. Паток апошніх, між тым, не прыпыняецца. Цяпер на Гомельшчыне налічваецца звыш 8 тысяч былых жыхароў Украіны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**
*astashkevich@zviazda.by*

— У сакавіку 2014 года мы набылі больш за сто самак і шэсць самцоў найлепшых еўрапейскіх ліній гэтага віду. З таго часу нарадзілася больш за сто сорак аленянят, — распавядае Раман Антушэвіч. — А сёлета атрымалі новае — ужо з беларускай радаслоўнай — пакаленне высакакласных аленяў.

Дзіўна, як жывёлы рэагуюць на з'яўленне егера. Пачуўшы гук яго машыны, алені ўважліва ўглядаюцца ў бок дарогі і, як толькі Раман спыняецца каля варот вальера, рухаюцца да загародкі з кармушкамі, бо ведаюць, што ў гэты час ім будзе сытны і смачны ласунак. Паперадзе заўсёды бягуць маладыя самцы, іх Раман выгадаваў, бо ад іх, маленькіх, адракліся маці, не давалі малака. Егер гадаваў аленянят дома, і цяпер яны давяраюць яму як нікому і заўсёды радасна сустракаюць.

Цяпер у паляўнічай гаспадарцы поўным ходам ідзе нарыхтоўка кармоў (сенажу, сена) на будучы халодны сезон. Праводзіцца кантрольнае ўзважванне пагалоў'я, вядзецца апрацоўка жывёл ад інфекцый. І ў той жа час дабудоўваецца плошча новага вальера для палявання, у якім будуць паляваць, як у старажытныя часы — з лукам і стрэламі.

Асобнай ад развядзення аленяў і штодзённых абавязкаў егера тэмай стаіць дачыненне Рамана Антушэвіча да вытворчасці беларускіх усюдыходаў. Быламу калгаснаму ветурачу, калі ён пачаў працаваць у паляўнічай гаспадарцы «Абстэрна», даверылі выпрабоўваць новую мадэль снегабалотахода беларускай вытворчасці. Шэсць гадоў таму ён у якасці кіроўцы вывучаў машыну, правяраў яе на вынослівасць у самых розных умовах, асабліва на балотах, на бездарожжы, снезе і вадзе. І ў тым, што беларускі ўсюдыход «БМЕ-1015» пастаўлены на канвеер і служыць людзям, дапамагаючы ім перамяшчацца ў цяжкадаступных месцах, ёсць і заслуга аленявода Рамана Антушэвіча.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
*anatol@zviazda.by*

*Мёрскі раён.*

Яшчэ больш фота на сайце zviazda.by



# ПААЗЕРСКІЯ АЛЕНІ






(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)